Цэнтральная раённая бібліятэка
Аддзел абслугоўвання і інфармацыі

# Думаць пра жывых, памятаць пра загінуўшых

*Дадатак да даведніка
па вуліцах Кобрына,
якія носяць імены ўдзельнікаў
Вялікай Айчыннай вайны*

Кобрын
2005

# Прадмова

12 кастрычніка 2005 года на сесіі раённага Савета дэпутатаў г. Кобрына было прынята рашэнне аб прысваенні вуліцам у квартале індывідуальнай застройкі па вуліцы Леніна (былы аэрадром) імён землякоў-герояў, удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны ***У. Кірмановіча і П. Гетмана.***





# Вуліца Кірмановіча

***Кірмановіч Уладзімір Мікалаевіч***, Герой Савецкага Саюза, палкоўнік. Нарадзіўся 5.11.1919 года ў Кобрыне. Закончыў курсы малодшых лейтэнантаў (1942), Ваенную акадэмію імя Фрунзе (1955). У Вялікую Айчынную вайну з мая 1942 года на Бранскім, Цэнтральным, 3-м і 4-м Украінскіх, 1-м і 2-м Прыбалтыйскіх франтах.

Камандзір знішчальнай процітанкавай батарэі капітан У. М. Кірмановіч вызначыўся пры вызваленні Латвіі. 22 жніўня 1944 года ў час танкавай контратакі праціўніка ў раёне пас. Букайшы Добельскага раёна батарэя на чале з Кірмановічам першая прыняла ўдар, падбіла і спаліла 6 танкаў, 3 самаходныя гарматы, што спрыяла паспяховаму наступленню савецкіх войскаў. За

гэты подзвіг У. М. Кірмановіч быў удастоены звання Героя Савецкага Саюза ў 1945 годзе.

Шматлікія заслугі Кірмановіча ў гады Вялікай Айчыннай вайны адзначаны ордэнамі Леніна (24.03.1945), Чырвонага Сцяга (02.05.1944), Аляксандра Неўскага (09.11.1944), двума ордэнамі Айчыннай вайны І ступені (22.01.1945; 06.04.1985), ордэнам Айчыннай вайны II ступені (02.09.1943), трыма ордэнамі Чырвонай Зоркі (16.03.1943; 06.01.1944; 30.12.1956), медалямі. Ён удзельнік двух гістарычных парадаў на Чырвонай плошчы ў Маскве: 7 лістапада 1941 года і на 24 чэрвеня 1945 года.

З 1960 года выкладчык Харкаўскага ваенна-авіяцыйнага вучылішча імя двойчы Героя Савецкага Саюза С. І. Грыцаўца. Да 1974 года ў Савецкай арміі.

На будынку кобрынскай СШ № 2, у якой вучыўся У. М. Кірмановіч, установлена мемарыяльная дошка.

Ганаровы грамадзянін г. Кобрына, уладальнік шматлікіх ордэнаў і медалёў розных ступеняў, Уладзімір Мікалаевіч Кірмановіч памёр у 2001 годзе, пахаваны на алее герояў у Харкаве.



# Вуліца П. Гетмана

Імя нашага земляка (ураджэнца в. Патрыкі), удзельніка падпольнага руху ***Паўла Гетмана***, прысвоена адной з вуліц г. Кобрына па рашэнні сесіі раеннага Савета дэпутатаў 12 кастрычніка 2005 года.

Па заданню падполля П. Гетман быў устроены на работу ў галоўны орган акупацыйнай улады асабістым шаферам нямецкага камісара Панцэра. Знаходзячыся ў непасрэднай блізасці да свайго “шэфа”, малады падпольшчык двойчы пытаўся яго ўзарваць. Спробы знішчыць начальства прывялі да таго, што за Паўлам сталі сачыць. Заўважыўшы гэта, Гетман рашыў ісці ў лес да партызан, але недалека ад горада быў схвачаны фашыстамі. Пасля доўгіх пытак, у час якіх Павел Гетман не выдаў нікога з удзельнікаў падполля, наш зямляк быў затраўлены сабакамі ва двары кобрынскай турмы.

# Д А Д А Т А К
# да даведніка
# па вуліцах Кобрына,
# якія носяць імены ўдзельнікаў
# Вялікай Айчыннай вайны
# «Думаць пра жывых,
# памятаць пра загінуўшых»

Складальнік:
С. Дз. Курачук
Рэдактар:
М. В. Іванова

225306 г. Кобрын, вул. Жукава, 12
Цэнтральная раённая бібліятэка
E-mail kobrin@brest.by